# РОЛЯ АДУКАЦЫІ Ў ЗАХАВАННІ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

# THE ROLE OF EDUCATION IN SAFEGUARDING OF INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE

А. Б. Сташкевіч
A. B. Stashkevich

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*факультэт сацыяльнакультурных камунікацый*
*вул. Курчатава, 5 220108, Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*e-mail: as.belicom@gmail.com*

---

У артыкуле разглядаецца пытанні інтэграцыі тэматыкі нематэрыяльнай кульпурнай спадчыны ў сістэму фармальнай і нефармальнай (дадатковай) адукацыі з мэтай забеспячэння яе пераемнасці ад пакалення да пакалення. Даследуюцца праграмныя дакументы ЮНЕСКА, сусветная практыка выкладання НКС на розных узроўнях адукацыйнага працэсу, аналізуецца беларускі вопыт ў гэтым накірунку, праблемы і перспектывы далейшага развіцця на этапе імплементацыі Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь.

The article deals with the integration of intangible cultural heritage into the system of formal and non-formal (additional) education to ensure its continuity from generation to generation. The program documents of UNESCO, the world practice of teaching cultural heritage at different levels of the educational process, the similar Belarusian experience, the issues and prospects of further development at the stage of the implementation of the UNESCO Convention for the Safeguarding of Intangible Cultural Heritage in the Republic of Belarus are studied.

Ключавыя словы: нематэрыяльная культурная спадчын; фармальная і нефармальная адукацыя; устойлівае развіццё; Канвенцыя ЮНЕСКА 2003 г.; традыцыйныя веды і практыкі; традыцыйная культура.

Keywords: intangible cultural heritage; formal and non-formal education; sustainable development; the 2003 UNESCO Convention; traditional knowledge and practices; traditional culture.

---

Адукацыя ў сваім агульным вызначэнні разглядаецца як сацыяльны інстытут, што дзейнічае ў выглядзе фармальных дзяржаўных і недзяржаўных устаноў, а таксама на ўзроўні дадатковых адукацыйных практык, якія ажыццяўляюць складаны навучальны працэс, накіраваны на авалоданне пэўным ведамі, навыкамі, вопытам і нормамі паводзін.

У парадыгме культурнай спадчыны адукацыя з'яўляецца дзейсным сродкам перадачы грамадзянскай супольнасці каштоўнаснай інфармацыі аб іх культурнай памяці. Для нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая адпаведна Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей – Канвенцыя 2003 г.) вызначаецца як сукупнасць пэўных нематэрыяльных праяўленняў (звычаі і абрады, іншыя формы творчага выказвання, веды і навыкі) і звязаных з імі інструментаў, артэфактаў і культурнага ландшафту, што перадаюцца з пакалення ў пакаленне і з'яўляюцца часткай ідэнтытэту адпаведных супольнасцей, групп ці асобных людзей (носьбітаў гэтай спадчыны) (Артыкул 2) [4, с. 5], пераемнасць з'яўляецца ключавым фактарам жыцця здольнасці гэтай спадчыны, якая забяспечвае яе пастаяннае аднаўленне і развіццё.

У традыцыйнай культуры, як вядома, пераемнасць ведаў і практыка жыцця ўяўлялася галоўным чынам праз непасрэдную камунікацыю прадстаўнікоў старэйшага пакалення з малодшымі ўнутры сям'і (рода), адной грамады ці праз узаемадзеянне ў працэсе супольнай дзейнасці. У сучасным культурным кантэксце межпакаленная перадача сацыяльна значнай інфармацыі адбываецца ў асноўным праз разгалінаваную сістэму адукацыі.

**Канцэпт адукацыі на аснове нематэрыяльнай культурнай спадчыны.** У Канвенцыі 2003 г. асноўнымі мэтамі адукацыі дзеля захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей – НКС) з'яўляюцца:

1. забеспячэнне прызнання і павагі гэтай спадчыны, павышэнне яе значэння ў грамадстве;
2. распаўсюджванне інфармацыі аб небяспецы, якая пагражае НКС, а таксама аб мерапрыемтвах, што праводзяцца ў межах яе аховы;
3. садзейнічанне захаванню прыродных і памятных месцаў, існаванне якіх неабходна для ажыццяўлення НКС (Артыкул 14).

Мяркуецца, што дасягненне гэтых мэтаў павінны быць рэалізавана сродкамі разнастайных адукацыйных праграм і мерапрыемстваў, прызначаных для адпаведных супольнасцей і груп, а таксама праз інтэграцыю ведаў пра НКС у фармальную і нефармальную адукацыю [4, с. 11].

Аперацыйнае кіраўніцтва да Канвенцыі 2003 г. дае больш разгорнутую характарыстыку тых мераў, якія неабходна прыняць для захавання НКС і якія, відавочна, датычацца адукацыі. Так, прапануецца інтэграваць тэматыку НКС у школьныя праграмы і распрацаваць для гэтых мэтаў неабходныя адукацыйныя матэрыялы: падручнікі, дапаможнікі, кампакт-дыскі, відэаматэрыялы, дакументальныя фільмы, брашуры. Падкрэсліваецца, што ў кожным выпадку неабходна ўлічваць лакальны кантэкст НКС. Варта таксама ўмацоўваць патэнцыял настаўнікаў у пытаннях выкладання тэматыкі НКС, далучаць бацькоў вучняў да распрацоўкі прапаноў адносна тэм і модулей у выкладанні НКС у школах. Надзвычай важным з'яўляецца далучэнне носьбітаў і практыкаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны да распрацоўкі адукацыйных праграм і для работы па тлумачэнню іх спадчыны ў школах і іншых вучэбных установах [5, с. 61].

Канвенцыя 2003 г. надае вялікую ўвагу развіццю нефармальных форм адукацыі ў дачыненні да НКС, а таксама ўкараненню практычных метадаў перадачы ведаў шляхам прамога ўдзелу ў ажыццяўленні НКС, а такасма з дапамогай гульняў, хатняга настаўніцтва і інтэграцыі ў асроддзе бытавання спадчыны. Сярод іншых форм навучання, якія рэкамендуюцца, – правядзенне адукацыйных летнікаў, конкурсаў фотаздымкаў і відэаматэрыялаў; развіццё маршрутаў культурнай спадчыны, арганізацыя школьных экскурсій па мясцінах, звязаных з нематэрыяльнай культурнай спадчынай. Шырокае выкарыстанне з мэтай папулярызацыі НКС разнастайных інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій тасама вітаецца [5, с. 62].

Адметнай рысай адукацыі дзеля захавання НКС з'яўляецца яе паслядоўны і сістэмны характар, навучанне на працягу ўсяго жыцця: ад маленства да сталасці. Працэс передачы ведаў пра НКС пачынаецца ад дзіцячага садку і працягваецца ў школьным перыядзе, а таксама – на ўзроўні вышэйшай адукацыі. Менавіта такі падыход забяспечвае засваенне традыцыйных ведаў і практык, выпрацоўвае павагу да сваёй спадчыны і спрыяе міжкультурнаму дыялогу паміж прадстаўнікамі розных культур.

Важным аспектам адукацыйнай палітыкі ў дачыненні да НКС лічыцца актыўны ўдзел носьбітаў НКС на ўсіх этапах яе рэалізацыі: ад дапамогі ў зборы матэрыялаў, распрацоўцы дапаможнікаў і відэа-урокаў, настаўніцтва для моладзі, фасілітацыі для на-

стаўнікаў, так і ў ажыццяўленні навучальных праграм для саміх носьбітаў і практыкаў (Аперацыйнай кіраўніцтва, п. 107 (м)) [5, с. 62]. Навучанне апошніх ажыццяўляецца па некалькіх напрамках. Найперш, яно звязана з тлумачэннем значэння самаго НКС, яе ролі ў развіцці грамадства і тэрыторый. Часам носьбіты нематэрыяльнай культурнай спадчыны недаацэньваюць яе каштоўнасць і неабходнасць захавання для будучых пакаленнях. Далей істотнымі і карыснымі для носьбітаў і практыкаў НКС могуць быць сучасныя веды па кіраванні прадпрыемствамі, арганізацыі турызму, маркетынгавым тэхналогіям, сацыяльнаму прадпрымальніцтву, абароне інтэлектуальнай уласнасці. Такія веды дапамогуць ім эфектыўна выкарыстоўваць іх спадчыну для атрымання дабрабыту, вырашэння праблем занятасці, развіццю невялікіх бізнэсаў на падставе традыцыйных рамёстваў і промыслаў.

Ажыццяўленне адукацыйнай палітыкі на падставе НКС выдатна карэлюецца з Парадкам дня ААН па ўстойлівам развіцці і адпавядае рэалізацыі мэты 4, звязанай з якаснай адукацыяй. ЮНЕСКА заахвочвае дзяржавы-удзельніцы Канвенцыі 2003 г. «прымаць належныя юрыдычныя, тэхнічныя, адміністратыўныя і фанансавыя меры», накіраваныя на: 1) забеспячэнне таго, каб адукацыя садзейнічала павазе да сваёй культуры, узаемапавазе да іншых культур, да носьбітаў НКС, вобраз жыцця якіх не павінен падвяргацца абразе ці мадэрнізацыі без іх згоды; 2) прызнанне значнай ролі традыцыйных спосабаў перадачы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія ўсхвалены самімі супольнасцямі, групамі ці асобнымі носьбітамі; імкненне выкарыстоўваць іх патэнцыял у фармальнай і нефармальнай адукацыі [5, с. 85].

Для дасягнення вышэйадзначанай мэты рэкамендуецца «узмацніць супрацоўніцтва і ўзаемадапаўняльнасць паміж рознымі практыкамі і сістэмі адукацыі»; садзейнічаць навуковым даследаванням і распрацоўцы адпаведных педагагічных метадалогій; спрыяць адукацыі ў галіне захавання ўстойлівай біяразнастайнасці і экалагічнай бяспекі, якая непасрэдным чынам звязана з аховай НКС» [5, с. 85–86].

ЮНЕСКА таксама адзначае, што «нематэрыяльная культурная спадчына можа забяспечваць «кантэксна-спецыфічны змест і педагагічныя інструменты для разгортвання адукацыйных праграм, дзейнічаць як драйвер для павышэння актуальнасці і якасці адукацыі, паляпшэння яе вынікаў» [8]. З гэтай мэтай арганізацыяй была распрацавана і актыўна ажыццяўляецца праграма «Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў фармальнай і нефармальнай адукацыі». На падставе справаздачы па выніках двух гадоў рэалізацыі гэтай праграмы ў сямі міжсектральных офісах ЮНЕСКА (асобных краінах Еўропы, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, Азіі і Ціхага Акеана) было адзначана, што інтэграцыя НКС у існуючыя навучальныя праграмы паказла сябе як эфектыўны падыход, які будуецца найперш на міждысцыплінарным супрацоўніцтве паміж рознымі ведамствамі (напрыклад, міністэрствамі культуры, адукацыі, аховы прыроды і інш.) і разгортванні шырокай праграмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі выкладчыкаў. Аднак кардынатарам праграмы прыйшлося сутыкнуцца з шэрагам праблем, якія галоўным чынам датычыліся наладжвання ўзаемаадносін паміж рознымі дзяржаўнымі сектарамі і сумеснага навучання экспертаў у галіне культуры і адукацыі з тым, каб у далейшым развіваць праграмную калабарацыю паміж дзейнасцю па ахове НКС і сферай адукацыі. Часам такая канцэпцыя ўзаемнага супрацоўніцтва патрабуе распрацоўкі адпаведнай палітыкі і інструментарыя ў краінах-удзельніцах, што няпроста [9].

Акрамя таго, ЮНЕСКА актыўна развівае глабальную партнёрскую сетку вышэйшых адукацыйных ўстаноў ва ўсім свеце. Лічыцца, што іх роля даволі значная ў падрыхтоўцы будучых кіраўнікоў і менеджараў у галіне нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Дзякуючы сеткаваму ўзаемадзеянню, універсітэты могуць абменьвацца рознымі па-

дыходамі і методыкамі, каб узбагаціць свае ўласныя праграмы і лепш зразумець, як інтэграваць у навучальны працэс ахову нематэрыяльнай культурнай спадчыны [1].

У межах пілотнага праекта для Азіяцка-Ціхаакеанскага рэгіёна ЮНЕСКА пратэсціравала наватарскія падыходы з мэтай адаптацыі тэматыкі НКС да ўмоў звычайнай школы і накіраваных, па словах Гванг-Джо Кім, дырэктара Азіяцка-Ціхаакеанскага рэгіянальнага бюро ЮНЕСКА па адукацыі, – «на выхаванне пакалення маладых людзей, якія будуць удзельнічаць у будаўніцтве лепшага і больш устойлівага свету» [7, с. 4]. У праекце прымалі ўдзел чатыры краіны: Пакістан, Палау, Узбекістан і Вьетнам. Па выніках праекта быўраспрацаваны і выдадзены дапаможнік пад назвай: «Нематэрыяльная спадчына ў сістэме навучання дзеля ўстойлівай будучыні». Дапаможнік утрымлівае рэкамендацыі для настаўнікаў школ, выкладчыкаў каледжаў, ВНУ, а таксама – устаноў дадатковай адукацыі (музеяў, адукацыйных і культурных цэнтраў, няўрадавых арганізацый і інш.) пра тое, як ім найлепшым чынам інтэграваць веды пра НКС у сістэму навучання. У якасці арыетыра прапануецца выкарыстаць сістэму чатырох крокаў ці этапаў. На першым этапе неабходна зразумець лакальны катэкст прыктыкі НКС (сабраць разам з вучнямі інфармацыю пра нематэрыяльную культурную спадчыну рэгіёна, ідэнтыфікаваць разнастайныя элементы НКС, запісаць інтэрв'ю з носьбітамі, даследаваць публікацыі на гэту тэму). На другім этапе рэкамендуецца распрацаваць канцэпцыю інтэграцыі гэтых ведаў у план урока па сваім прадмеце. На трэцім – рэалізаваць задуманае, задакументаваць вынікі і абмеркаваць іх з калегамі. На апошнім этапе неабходна ацаніць дасягнутае і працягваць рэалізовываць гэтыя падыходы ш сваёй працы [7, с. 31]. Асаблівая каштоўнасць вышэйадзначанага даведніка ў тым, што ў ім падрабязна даследуецца вопыт і прыводзяцца методыкі ўкаранення інфармацыі пра НКС у разнастайныя школьныя дысцыпліны як гуманітарнага, прыродазначага, так і навукова-тэхнічнага профіля, а таксама даюцца прыклады плнаў урокаў і падыходы да ацэнкі ведаў [7].

**Беларускія адукацыйныя практыкі ў галіне НКС.** Існуе некалькі спосабаў далучэння нематэрыяльнай культурнай спадчыны да сістэмы адукацыі: 1) праз перадачу ведаў пра НКС і 2) шляхам інтэграцыі НКС у фармальную і нефармальную адукацыю (адукацыя разам з НКС).

У першым выпадку гаворка ідзе ў асноўным пра арганізацыю спецыяльных урокаў па тэматыцы нематэрыяльнай культурнай спадчыны ці вылучэння асобнага прадмета навучання. Настаўнік можа распавесці пра пэўную традыцыйную практыку, сістэму жыццядзейнасці, уменні і веды, альбо пра значэнне і вытокі мясцовай традыцыі ці пра тое, як выпрацоўваецца традыцыйнае адзенне. «Жывая» спадчына прапануе мноства прыкладаў, якімі можна падзяліцца ў класе, і пры вучэнні іншых прадметаў, напрыклад, гісторыі, мовы, літаратуры.

Навучанне разам з нематэрыяльнай культурнай спадчынай адбываецца шляхам укаранення яе змесу і значэння ў шырокі спектр прадметаў, такіх як мовы, матэматыка, фізіка, хімія, фізічная культура, грамадазнаўства, біялогія і інш. Пры гэтым фармат урокаў становіцца больш актуальным і цікавым, паколькі цесна звязаны з акаляючым асроддзем навучэнцаў, абапіраецца на веды, якія захоўваюцца ў іх сям'і ці супольнасці і ўяўляюць пэўныя асацыяцыі і сэнсы для вучняў. Натуральна, гэта можа значна палегчыць засваенне матэрыялу. Урокі, якія ўключаюць інфармацыю пра «жывую» спадчыну, заахвочваюць вучняў да большай цікавасці да яе, развіваюць трывалыя сувязі са сваімі сем'ямі, сябрамі і супольнасцямі. Інтэграцыя «жывой» спадчыны ў адукацыю злучае вучняў з іх мінулым, адзін з адным і з шырокім светам. Яна накіравана на іх самаідэнтыфікацыю і развіццё павагі да іншых культур, што надзвычай важна для разумення сябе і свайго месца ў грамадстве.

Элементы НКС[1] могуць адначасова закранаць некалькі школьных прадметаў. Напрыклад, аповяд пра прыродныя аб'екты (камяні, крыніцы, дрэвы), надзеленыя сакральным зместам, можа мець месца на ўроках прыродазнаўства, геаграфіі, літаратуры, гісторыі. Гэта спрыяе супрацоўніцтву паміж настаўнікамі розных дысцыплін, пошуку новых інавацыйных падыходаў і метадаў навучання.

Як сведчыць Перыядычны (нацыянальны) справаздачны даклад Рэспублікі Беларусь 2021 г., веды пра нематэрыяльную культурную спадчыну на першай ступені навучання інтэграваны ў шэраг абавязковых школьных прадметаў, такіх як «Чалавек і свет», «Мая Радзіма – Беларусь». Дзеці знаёмяцца з беларускай міфалогіяй, тапанімікай, фальклорам, вывучаюць абрады і святы, народныя гульні, беларускія народныя строі. На уроках працы дзеці практыкуюць беларускія народныя рамёствы, такія як выцінанка, саломапляценне, вышыўка і інш. На другой і трэцяй ступені адукацыі падчас урокаў гісторыі і геаграфіі даследуюць гісторыю, прыродны і культурны ландшафт сваёй мясцовасці, дэмаграфію, сацыяльныя працэсы. Беларускія рамёствы і фальклор таксама вывучаецца ў працэсе факультатыўнай і гуртковай работы ў школах [6].

Дашкольная адукацыя таксама прапануе шэраг актыўнасцей, звязаных з засваеннем ведаў пра нематэрыяльную культурную спадчыну краіны. Вывучаецца беларускі фальклор, народныя песні, але найбольш актуальным і распаўсюджаным з'яўляецца вывучэнне беларускіх народных гульняў. Да прыкладу, у пошукавай сістэме Google можна знайсці больш 60 000 спасылак на тэму: «беларускія народныя гульні» (на беларускай і рускай мове). Сярод іх – інфармацыя з розных навучальных устаноў, ад дзіцячага садка да школ, метадычныя распрацоўкі і рэкамендацыі, жывыя прыклады і практыкі.

У сістэме вышэйшай адукацыі асобныя курсы па вывучэнні нематэрыяльнай культурнай спадчыны ёсць у Беларускім дзяржаўным універсітэце (далей – БДУ), на гістарычным і філалагічным факультэце. Яны ўключаюць заканадаўчыя і практычныя аспекты аховы НКС. На гістарычным факультэце таксама існуе спецыяльная магістарская праграма па НКС. Вывучэнне НКС уключана ў агульны курс па ахове культурнай спадчыны на факультэце сацыяльна-культурных камунікацый БДУ. Для будучых музейных работнікаў у БДУ чытаецца спецыяльны курс: «Інтэрпрэтацыя НКС у музеі». НКС як частка курса па ахове спадчыны ўключана ў праграму падрыхтоўкі спецыялістаў па традыцыйнай культуры і фальклоры ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў (далей – БДУКМ). На факультэтах харэаграфіі і народных спеваў БДУКМ падрабязна вывучаецца беларускі народны танец, музыка і песенная творчасць. Вывучэнне НКС як рэсурса для ўстойлівага турызму ўключана ў падрыхтоўку турыстычных менеджэраў у БДУ, Інстытуце менеджменту спорту і турызму (Мінск), шэрагу рэгіянальных універсітэтаў у Гомелі, Гродне, Віцебску, Брэсце і Магілёве. Народна-інструментальная музычная культура Беларусі вывучаецца ў Беларускай Акадэміі музыкі [6].

Нягледзечы на даволі шырокі ахоп даных, звязаных з увядзеннем тэматыкі НКС у сістэму фармальнай адукацыі, рэальная практыка паказвае, што ў выкладанні НКС існуюць дзве істотныя праблемы, якія пакуль не дазваляюць гаварыць аб інтэграцыйным характары гэтых адукацыйных ініцыятыў. Першая праблема праяўляецца ў недастатковай увазе да мясцовага кантэнту НКС, а часам і ў поўным яго ігнараванні. Іншымі словамі, даецца досыць уніфікаваны вобраз беларускай традыцыйнай культуры і фальклору, без акцэнту на мясцовыя веды і практыкі, а таксама носьбітаў гэтых ведаў і практык. Другая праблема наўпрост звязана з далучэннем супольнасцей, груп і асобных людзей – стваральнікаў і захавальнікаў нематэрыяльнай культутрнай спадчыны –

[1] Элемент НКС – прынятае ў ЮНЕСКА абазначэнне адзінкавых праяўленняў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, эксвівалента – аб'ект спадчыны (у дачыненні да матэрыльнай спадчыны).

да працэса навучання. Між тым, прамое ўзаемадзеянне вучняў і студэнтаў з носьбітамі традыцый дэманструе вынікі больш эфектыўнай перадачы НКС, чым пры завочным і уніфікаваным навучанні. Гэта выдатна паказалі сёлетнія іспыты студэнтаў 3-га курса спецыяльнасці «этнафоназнаўства» БДУКМ, якія ў 2021 г. мелі актыўную камунікацыю з удзельнікамі мясцовых фальклорных калектываў Жыткавічскага раёна Гомельскай вобласці падчас летняй практыкі і экспедыцыі.  ЮНЕСКА падкрэслівае, што асноўная мэта адукацыі ў кантэксце аховы НКС – гэта забеспячэнне яго пераемнасці ад пакалення да пакалення. Таму далучэнне носьбітаў НКС да стварэння адукацыйных праграм і на этапе іх выкладання з’яўляецца вельмі важным фактарам захавання гэтай спадчыны ў будучым [2].

У нефармальнай (дадатковай) адукацыі Беларусі, тым не менш, існуе досыць прыкладаў інтэграцыйнага падыходу да навучання НКС. У Беларусі, дзе захавалася разгалінаваная сістэма разнастайных дамоў і цэнтраў фальклора, рамёстваў, сельскіх клубаў і гарадскіх культурных цэнтраў, устаноў дадатковай адукацыі моладзі, вядзецца рэальная праца па вывучэнню мясцовых рамёстваў і промыслаў, фальклорных традыцый. Стала звычайнай практыкай, калі выкладаннем займаюцца самі рамеснікі, носьбіты і транслятары НКС. Сярод лепшых адукацыйных практык – дзейнасць Марыны Гушчы з Гарадоцкага дома рамёстваў і фальклору, якая на працягу многіх гадоў пераймала тэхніку ажурнага ткацтва непасрэдна ў мясцовых майстрых, а сёння выкладае яе сама і актыўна прасоўвае[2]; ці, да прыкладу, адукацыйныя праекты па перадачы ўменняў і навыкаў, звязаных з мастацтвам выцінанкі, якія рэалізоўвае Маладзечанская школа выцінанкі, што цягам многіх гадоў існуе ў Маладзечанескім музычным каледжы імя М. К. Агінскага, і дзякуючы якой Беларусь захавала гэта старажытнае рамяство[3]. Курсы па розных тэмах, звязаных з НКС, сістэматычна арганізуе Студэнцкае этнаграфічнае таварыства (СЭТ). З найбольш вядомых – праграма «Шыем касцюм», якая прываблівае штогод шмат жадаючых. На курсах людзі, пад кіраўніцтвам вопытнага трэнера, праектуюць і шыюць народны строй і затым удзельнічаюць у ім на розных народных святах і фестывалях. СЭТ таксама праводзіць курсы ў гарадах Беларусі па народных танцах, спевах. Удзельнікі таварыства ладзяць трэнінгі для прадстаўнікоў мясцовых супольнасцяў, звязаных з НКС, падчас летніх экспедыцый[4]. З 2016 г. СЭТрэалізуе вэб-платформу ETHNO.by – анлайн-медыя-бібліятэку. Мэта праекта – сабраць найбольш поўную інфармацыю аб усіх апублікаваных матэрыялах па традыцыйнай культуры, уключаючы кнігі, навуковыя публікацыі, музычныя рэлізы, дакументальныя фільмы і тэлешоу і г. д. Цяпер база даных змяшчае каля 10 000 запісаў (не лічачы назваў населеных пунктаў) і пастаянна расце[5]. Ёсць таксама прыклады, калі прадстаўнікі мясцовых супольнасцей уцягнуты не толькі ў працэс перадачы ведаў, але і з'яўляюцца ініцыятарамі і арганізатарамі розных семінараў і курсаў. Напрыклад, Георгій Ціманаў, актывіст і пастаянны ўдзельнік абраду «Калядныя цары» в. Семежава (Мінская вобласць), уключанага ў Спіс тэрміновай НКС (ЮНЕСКА), ужо на працягу многіх гадоў праводзіць курс навучання навыкам, звязаным з практыкай элемента НКС, для мясцовай моладзі. Майстар музычных духавых інструментаў Мар'ян Скрам-

[2] “Ажурны” гарадоцкі брэнд/ Настаўніцкая газета, 11 верасня 2022//https://nastgaz.by/azhurny-garadotski-brend/

[3] Лізавета Чырвонцава Маладзечанская школа выцінанкі //https://vytinanka.by/maladzechanskaja-shkola-vycinanki/

[4] https://set.ethno.by

[5] https://ethno.by

блевіч (Гродзенская вобласць) адкрыў школу ў сваёй уласнай майстэрні для мясцовых дзяцей, перадае ім веды і вопыт па стварэннютрадыцыйных музычных інструментаў, а таксама чытае лекцыі для ўсіх ахвочых па гісторыі беларускай народнай музыкі [6].

Досыць распаўсюджаным спосабам перадачы традыцыйных ведаў і вуснай народнай творчасці ў беларускім кантэнце сталі моладзевыя летнікі, напрыклад, летнік «Пятровіца»[6], які на працягу шасці гадоў ладзіцца ў Любанскім раёне Мінскай вобласці, летнік традыцыйнага ткацтва «Кросенцы» ў Неглюбцы Веткаўскага Гомельскай вобласці[7] або летнік «Карагоднае кола», які сёлета прайшоў у в. Пагост Жыткавічскага раёна Гомельскай вобласці[8]. Адметнасцю такой формы нефармальнай адукацыі як летнікі з'яўляецца пагружэнне удзельнікаў у асяроддзе бытавання пэўнай супольнасці НКС, знаёмства з традыцыйнымі практыкамі ад кулінарыі да промыслаў і рамёстваў, прамая камунікацыя з носьбітамі традыцый, пранікненне ў культуру паўсядзённасці сучаснай беларускай вёскі, спасціжэнне і далучэнне да іх культурных каштоўнасцей. Гэта значна абагачае кругагляд моладзі, пашырае панараму іх культурнага арэолу, спрыяе іх самаідэтыфікацыі і фарміраванню нацыянальнай свядомасці.

Такім чынам, адукацыя на інстытуцыяльным узроўні і на ўзроўні нефармальных адукацыйных ініцыятыў мае выключнае значэнне для перадачы ведаў і навыкаў, звязаных з нематэрыяльнай культурнай спадчынай ад пакалення да пакалення. У сучасным грамадстве яна выконвае ролю рэтранслятара для НКС, далучаючы моладзь да спадчыны іх бацькоў і дзядоў, а таксама выступае ў ролі своеасаблівага медыятара паміж пакаленнямі, паміж носьбітамі і іншымі прадстаўнікамі грамадства. Вось чаму ЮНЕСКА, якая ініцыявала і правяла ў 2003 г. Канвенцыю аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, заахвочвае краіны-ўдзельніцы да прыняцця адпаведных рашэнняў і разгортвання міжсектаральнай палітыкі па інтэграцыі НКС у сферу адукацыі. З гэтай мэтай ЮНЕСКА ужо прыняла і актыўна рэалізоўвае шэраг праграм і праектаў у розных краінах свету, стварае дапаможнікі і ажыццяўляе дзейнасць па нарошчванню патэнцыяла сярод настаўнікаў школ, выкладчыў універсітэтаў і спецыялістаў па ахове НКС.

Беларускі вопыт міждысцыплінарнага супрацоўніцтва паміж культурай і адукацыяй яшчэ не надта вялікі, аднак працэс далучэння нематэрыяльнай культурнай спадчыны да выкладання шэрагу афіцыйна зацверджаных дысцыплін у школах і вышэйшых навучальных установах ужо разгортваецца. На больш высокім узроўні актыўнасці адбываецца інтэграцыя НКС у нефармальным (дадаковым) сектары адукацыі, якая на сённяшні дзень сканцэнтравана ў асноўным на вывучэнні і папулярызацыі беларускіх рамёстваў і промыслаў, фальклору, міфалогіі. Далейшая, больш глыбокая і сістэмная інтэграцыя тэматыкі НКС у сістэму адукацыі, якая закране не толькі гуманітарныя прадметы, але і дысцыпліны прыродазнаўчага і тэхнічнага профілю, праз інтэнсіўнае даследаванне традыцыйных ведаў і практык, камунікацыю з ноьбітамі гэтых практых і далучэнне іх да працэсу навучання, адбудзецца на наступным этапе імплементацыі Канвенцыі 2003 г. у Рэспубліцы Беларусь, наладжвання актыўнага супрацоўніцтва паміж рознымі ведамаствамі і арганізацыямі, выпрацоўкі агульнай міжсектаральнай палітыкі ў дачыненні аховы НКС і засваення эфектыўных сусветных практык у гэтым напрамку.

[6] https://piatrovica.by

[7] https://www.vetka-museum.by/naviny/653-letnik-neglyubskaga-tkatstva-krosentsy-z-15-pa-20-zhniunya-2022.html

[8] https://radiokultura.by/be/peredacha/belaruskaya-etnafoniya

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Global tertiary education networking//UNESCO [Electronic resource]. –URL: https://ich.unesco.org/en/global-tertiary-education-networking-00976 (дата обращения: 09.09.2022).

2. Живое наследие и образование. Международная конвенция об охране нематериального культурного наследия. Брошюра. ЮНЕСКО, 2019 [Электронный ресурс]. URL: https://ich.unesco.org/doc/src/46212-RU.pdf (дата обращения: 05.09.2022).

3. Integrating intangible cultural heritage in education Intersectoral meeting with Education Institutes and Programmes 17–19 May 2017, Paris, France.Summary Report [Electronic resource] URL: https://ich.unesco.org/doc/src/Meeting_report_EN.pdf. (дата обращения: 09.09.2022).

4. Международная конвенция об охране нематериального культурного наследия // Основные тексты Международной конвенции об охране нематериального культурного наследия 2003 г. ЮНЕСКО, 2018. С. 1–22.

5. Операционное руководство по выполнению Конвенции об охране нематериального культурного наследия // Основные тексты Международной конвенции об охране нематериального культурного наследия 2003 г. ЮНЕСКО, 2018. С. 22–165.

6. Перыядычная (нацыянальная) справаздача Рэспублікі Беларусь аб выкананні Міжнароднай канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, 2021 / Periodic Report on the Convention for the Safeguarding of the Intangible Cultural Heritage (Belarus, 2021) [Electronicresource]. URL: https://ich.unesco.org/en-state/belarus-BY?info=periodic-reporting#rp (дата обращения: 09.09.2022).

7. Нематериальное наследие в системе обучения в интересах устойчивого будущего Руководство для преподавателей в Азиатско-Тихоокеанском регионе. ЮНЕСКО, 2019.

8. Safeguarding intangible cultural heritage in education//UNESCO [Electronic resource]. URL: https://ich.unesco.org/en/education-01017 (дата обращения: 07.09.2022).

9. Safeguarding intangible cultural heritage in formal and non-formal education. Intersectoral Meeting, 7–8 October 2019. UNESCO Summary report [Electronic resource]. URL: https://ich.unesco.org/doc/src/48763-EN.pdf. (дата обращения: 10.09.2022).